Освоение этого раздела предоставляет возможность творческого развития и самореализации учащихся, а также позволяет расширить творческие связи и наладить тесное сотрудничество с другими творческими коллективами. Результатом освоения данного раздела стали достойные победы и заслуженные награды хореографического коллектива «Веселая карусель» на республиканских и международных конкурсах хореографического искусства.

Ведущей идеей образовательной программы «В ритме танца» является пошаговое, следующее принципу от простого к сложному, освоение учащимися хореографического искусства. Реализация программы позволяет обеспечить благоприятные условия для успешного обучения, развития и воспитания участников коллектива «Веселая карусель» средствами хореографического творчества, многие из которых, связав свою дальнейшую жизнь с творчеством, занимаются хореографией профессионально. Приказом Министерства культуры Республики Беларусь № 513 от 30 августа 2018 г. хореографическому коллективу ГУО «Витебский городской центр дополнительного образования детей и молодежи» «Веселая карусель» (руководитель – Е.В. Маркова) за значительный вклад в развитие любительского художественного творчества, популяризацию национальных культурных традиций, соответствующий художественный уровень и творческие показатели присвоено звание «народный» («образцовый»).

Список цитированных источников:


1. Кодекс Республики Беларусь об образовании. – Минск: Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2011. – 254 с.
2. Государственная программа "Образование и молодежная политика" на 2016 – 2020 годы // Совет Министров Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.government.by/ru/solutions/2450. – Дата доступа: 26.12.2016.
3. Типовая программа дополнительного образования детей и молодежи (художественный профиль) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://drive.google.com/file/d/1rSJvtntrQjEp7tGdfrKkL6qDjkjZnEvY/view.– Дата доступа: 06.01.2019.


## МАСТАЦКАЕ АСЭНСАВАННЕ АСОБЫ І ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ У ЭСЭ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА


**Налётава Н.М.**, аспірант
(г. Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава)
Навуковы кіраўнік – Бароўка В.Ю., доктар філал. навук, прафесар


У беларускай літаратуры ХХ-пачатку ХХІ стагоддзя значнае месца займае мастацкая рэпрэзентацыя вобразаў вядомых асветнікаў, публіцыстаў, мастакоў, кампазітараў і інш. дзеячаў, якія, бясспрэчна, з'яўляюцца сімваламі нашай нацыі і дасягненнямі якіх можа ганарыцца сучаснае пакаленне. Зварот пісьменнікаў да велічнага мінулага падначалены наступнай мэце: падкрэсліць значнасць айчыннай культуры ў кантэксце сусветнай і папулярызаваць яе найбольш выдатных прадстаўнікоў. Таму можна сцвярджаць, што беларуская літаратура акрэсленага перыяду заклікана садзейнічаць выхаванню патрыятычных пачуццяў і грамадзянскай самасвядомасці беларусаў, што надзвычай важна ва ўмовах існуючага нацыянальнага нігілізму.

Варта адзначыць, што ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве праблеме аналізу мастацкіх вобразаў нацыянальных дзеячаў культуры, у прыватнасці жывапісцаў, нададзена недастаткова ўвагі. Да прыкладу, разгляду асобных твораў В. Кара-

Репозиторий ВГУ

мазава прысвечаны артыкулы “Мастацкае асэнсаванне асобы і творчасці Гаўрылы Вашчанкі ў аповесці “Чырвоная брама” Віктара Карамазава” Н.М.Налётавай (2018), “Мастацкае ўвасабленне постацей беларускіх жывапісцаў В. Карамазавым-эсэістам” В.Р.Каўшар (2014). Сярод іншых даследаванняў творчасці абранага намі пісьменніка варта адзначыць манаграфію “Сусвет і свет душы: творчая індывідуальнасць Віктара Карамазава” Д.І.-Т. Дудзінскай (2008), у якой, аднак, не прааналізавана эсэістыка.

Мэта дадзенага *даследавання* заключаецца ў выяўленні асаблівасцей мастацкай рэпрэзентацыі асобы і дзейнасці знакамітых беларускіх творцаў у эсэ сучаснага беларускага пісьменніка, журналіста і таленавітага мастака В. Карамазава.

Матэрыялам для нашага даследавання ўзяты эсэ “Размова з аўтапартрэтам”, “З вокам і сэрцам Дон Кіхота”, “Крынічыць срэбра” вышэйзгаданага пісьменніка. Асноўнымі для навуковага аналізу сталі *прыёмы канкрэтна-гістарычнага* і *дэскрыптыўнага метадаў*.

З канца ХХ стагоддзя В. Карамазаў актыўна папулярызуе знакамітых асоб з айчыннага выяўленчага мастацтва. Да прыкладу, з белетрызаваных біяграфій мастакоў варта ўзгадаць аповесць-эсэ аповесць “Чырвоная брама” (пра народнага мастака Беларусі, неаднаразова ўганараванага Міжнародным Біяграфічным Цэнтрам г. Кембрыджа званнем “Чалавек года”, а ў 1993 годзе і “Чалавек ХХ стагоддзя” Гаўрылу Харытонавіча Вашчанку, ураджэнца Гомельшчыны), эсэ “Зачараваная душа” (пра вучня Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, прыхільніка традыцый рускага рэалізму Антона Стафанавіча Бархаткова, выхадца з Магілёўшчыны), эсэ “Урокі мастака” (пра жыццёвы і творчы шлях савецкага мастака-жывапісца, графіка, майстра экслібрыса, прадстаўніка беларускага імпрэсіянізму Міколы Лукіча Тарасікава) і інш. Некаторыя эсэ В. Карамазава прысвечаны асобным творам выяўленчага мастацтва: “Зімовы сон” (карціне савецкага жывапісца Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі), “Бярозавы шлях” (карціне “Бярозавая дарога” Антона Стафанавіча Бархаткова), “Партызанская мадонна” (аднайменнай карціне народнага мастака Беларусі і СССР Міхаіла Андрэевіча Савіцкага).

Рэпрадукцыі карцін М. Савіцкага, А.Бараноўскага і М.Тарасікава можна выкарыстоўваць на ўроках беларускай літаратуры пры разглядзе пейзажнай і ваеннай лірыкі, пры знаёмстве вучняў з такімі асноўнымі паняццямі, як ідэя, тэма, кампазіцыя. Акрамя таго, творы выяўленчага мастацтва ранейзгаданых асоб рэкамендаваны сучаснай праграмай для азнаямлення пры вывучэнні тэмы “Выразнасць мастацкага слова” (“Восень на Прыпяці” А.Бараноўскага) у V класе, “Літаратурны твор – складанае і непадзельнае мастацкае адзінства” (“Дзеці вайны”, “Партызаны. Блакада” М. Савіцкага) у V класе, “Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство” (“Воблакі плывуць над зямлёй роднай” А.Бараноўскага) у VI класе, “Тэмы і вобразы мастацкай літаратуры” (“Поле” М.Савіцкага) у VI класе, “Паэзія. Разнастайнасць ідэйна-эстэтычнага пафасу паэтычных твораў” (“Лічбы на сэрцы” М.Савіцкага) у VII класе, “Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945)” (серыя карцін “Лічбы на сэрцы” М.Савіцкага, “Брацкія магілы” М.Тарасікава) у Х класе, “Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945–1965)” (“Партызанская мадонна (Мінская)” М.Савіцкага) у ХІ класе.

Падрабязнаму даследаванню жыццёвага і творчага шляху вядомага беларускага жывапісца ХІХ стагоддзя Івана Фаміча Хруцкага прысвечана эсэ “Размова з аўтапартрэтам”. Як заўважае сам В.Карамазаў, пранікнуць ва ўнутраны свет гэтага вядомага беларускага мастака яму дапамог “Аўтапартрэт”: “У нязмушаных, як перад Богам, прастаце і шчырасці прачытваецца споведзь адначасова і мужыка, пана сахі і касы, і сына вясковага святара, і акадэміка” [1, с. 105]; “Але колькі славянскага каларыту ў абліччы мастака на аўтапартрэце! Акадэмізм і слава хіба што ў спакоі, упэўненасці, што сумленнем, працай, талентам пазыкі пагасіў і Богу, і краю роднаму” [1, с. 105]; “І



Рэпазіторый ВДУ

зноў жа – твар. Так, ён спакойны, годны, з халодным мудрым роздумам пра вечнае, рэальнае, а разам з тым ёсць у ім рамантызм” [1, с. 105]. Увогуле створаныя мастаком пейзажы і партрэты вядомых асоб вылучаюцца, на думку эсэіста, “глыбокім пранікненнем у характары і псіхалогію чалавека, высокім майстэрствам” [1, с. 106].

Як справядліва адзначае В.Карамазаў, на светапогляд, гарманічнае развіццё і мастацкую дзейнасць І.Хруцкага істотны ўплыў аказала беларуская прырода: “… жыла сям’я ў асноўным з працы на зямлі, як жылі вакол сяляне, дарамі поля, лесу, рэчкі. Адсюль і нацюрморты: ад любові да свайго поля, лесу, саду, а шырэй – да роднага краю” [1, с. 105]. У згаданым эсэ шмат увагі адводзіцца народазнаўчаму матэрыялу, адлюстраванаму на палотнах мастака. Акрамя таго, эсэіст спрабуе адшукаць вытокі таленту І. Хруцкага і робіць высновы, што ён “меў сваёй глебаю народную эстэтыку, мараль, вясковы дэмакратызм, але ўсё простанароднае не толькі не перашкаджала мастаку стаць сваім у акадэмічных салонах, але і паспрыяла заняць тут сваё адметнае і годнае месца” [1, с. 105].

Складаныя жыццёвыя абставіны (смерць бацькі і клопат аб сям’і) прымусілі І.Хруцкага, акадэміка, прызнанага ў Расіі майстра жывапісу, вартага такіх сваіх славутых настаўнікаў, як Карл Брулоў, Арэст Кіпрэнскі, Аляксандр Варнек, ахвяраваць паспяховай кар’ерай: “… ён пакідае царскую сталіцу, акадэмію, вяртаецца ў вёску на сталае, да скону, жыццё. Нібыта бярэ развод з самім мастацтвам. <…> Як чалавек веры і абавязку, ён не можа зрабіць іначай” [1, с. 105]. Матэрыяльная неўладкаванасць прымусіла ў 1840-я гады пагадзіцца на супрацоўніцтва з віленскім архіепіскапам Сямашкам, хаця “далёка не ўсё, зробленае ў гэтыя гады …, задавальняе мастака” [1, с. 106], значна абмяжоўвае яго творчую свабоду.

Шматаспектная творчасць Яўгена Яўстаф’евіча Красоўскага, савецкага мастака-жывапісца і графіка, які жыў і ствараў у Мінску, рэпрэзентуецца В.Карамазавым у эсэ “З вокам і сэрцам Дон Кіхота”. Творчая індывідуальнасць Я. Красоўскага, як слушна заўважае эсэіст, выразна выяўляецца ў яго работах: “… мастак і тут мае свой твар, сваю душу, усюды, у кожнай рабоце, глядзіцца арыгінальным, смелым, вынаходлівым жывапісцам, каларыстам, у яго тут вострае вока, свае рытмы, свая мелодыя, свае тонкія настроі” [2, с. 104]; “У яго была свая і форма, і эстэтыка эцюда. Яго прастору ён сшываў святлом, яго гульнёю з колерам і гукам” [2, с. 105]; “У кожнай мініяцюры чуеш яго даверлівы голас” [2, с. 104].

Цытаты з незакончанай навелы Я.Красоўскага, прыведзеныя ў эсэ, раскрываюць мастакоўскае разуменне таленту і сэнсу жыцця адоранага творцы. Да прыкладу, у гэтым творы талент інтэрпрэтуецца як Боскі дар: “Толькі мастак бачыць глыбінную красу жыцця, чалавека, навакольнай прыроды, іх жывыя формы, фарбы, малюнак. Гэта – багацце і шчасце мастака. Як дар гасподні атрымаўшы ад прыроды, яму не трэба большага – ні славы, ні багацця. Большага багацця не існуе. Ён годны, шчодры і шчаслівы нават і тады, як голы і галодны” [2, с. 105]; “Вока мастака – ад Бога. Гэта вока Сярова, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэля, Урубеля: усе бачыць, працінае наскрозь, паліць агнём, гіпнатызуе” [2, с. 104].

У эсэ “З вокам і сэрцам Дон Кіхота” ў адносінах да Я.Красоўскага аўтарам выкарыстоўваюцца слушныя заўвагі тыпу “выдатны, з таленавітым вокам мастак” [2, с. 104], “рэаліст, імпрэсіяніст” [2, с. 105], “адзін з першых беларускіх постімпрэсіяністаў” [2, с. 105], якія падкрэсліваюць разнастайнасць творчых пошукаў гэтай вядомай асобы. Эсэістам даводзіцца думка, што глыбей зразумець гэтага, бясспрэчна, незвычайна мужнага і самаахвярнага мастака можна толькі шляхам аналізу яго творчасці ў гістарычным кантэксце: “У той час, у дваццатыя, трыццатыя, саракавыя гады, нават нечаканая плямка ад Сезана ці Маціса дражніла ўладу, магла пуцёўку выпісаць у “зону”. Але ці быў расчараваны тым мастак?” [2, с. 105].



Рэпазіторый ВДУ

Такім чынам, у эсэ “З вокам і сэрцам Дон Кіхота” беларускі мастак Я. Красоўскі рэпрэзентуецца жыццярадасным, апантаным, смелым, самаадданым і арыгінальным творцам, які даволі паспяхова выявіў сябе ў разнастайных жанрах і напрамках.

У эсэ “Крынічыць срэбра” апавядаецца пра вопытнага педагога, акадэміка, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага мастака Беларусі, сусветна вядомага жывапісца ХХ –пачатку ХХ стагоддзя Анатоля Васілевіча Бараноўскага, ураджэнца Мінска. Варта сказаць, што сярод вызначальных рыс характару А.Бараноўскага эсэіст вылучае найперш працавітасць і самаахвярнасць: “Кожную раніцу прыходзіць у сваю майстэрню – да вечара працуе. Бывае, што ўвечары стаіць перад мальбертам. Сядзіць – у вачах карціны. Напісаныя і не напісаныя. Праз іх і думкі. І гэта ўжо не праца, а жыццё. У працы? Але і ў радасці. Ён рады, што жыве там, што на душы, у сэрцы, што поўнасцю, нарэшце, адданы любімай справе” [3, с. 106-107]. Акрамя таго, аналізуючы карціны “Сувязь часоў” і “Нараджэнне дня” А.Бараноўскага, эсэіст слушна заўважае: “… сапраўднае мастацтва ствараецца адкрытаю душой, балесным сэрцам, агаленымі нервамі, бясконцай шчырасцю” [3, с. 106]. Вышэйзгаданыя карціны, па справядлівай заўвазе В.Карамазава, аб’ядноўвае культ святла: “Святло – дар Божы. І самы першы. У аснове ўсяго, што стварыў Бог, было святло. Яно – само жыццё. Кожны мазочак на палатне павінен быць светланосным. <…> Ім свеціць кожная карціна на сцяне” [3, с. 107].

У эсэ “Крынічыць срэбра” В.Карамазаў спыніўся таксама на адлюстраванні эвалюцыі творчай манеры мастака: “… Адчуў, што надышоў час палюбіць майстэрню. І гэта былі не ўцёкі ад прыроды… Адчуў, як не адчуваў раней, неабходнасць больш глыбока думаць над кожным творам, быць у працы не толькі натуралістам, майстрам эцюда, экспромту, але ў поўным сэнсе мысляром, у вобразным матэрыяле шукаць абагульненні, складаную формулу вечнага хараства і сэнсу” [3, с. 106].

Па падставе вышэйсказанага можна зрабіць наступныя высновы:

1) Мастацкая рэпрэзентацыя дзеячаў айчыннай культуры ў прааналізаванай прозе В.Карамазава была накіравана на акцэнтаванне ідэі, што выдатныя мастакі – сведчанне высокага духоўнага, інтэлектуальнага патэнцыялу нашага народа.

2) Унутраны свет беларускіх мастакоў ў эсэ “Размова з аўтапартрэтам”, “З вокам і сэрцам Дон Кіхота”, “Крынічыць срэбра” выяўляецца праз аўтапартрэт (І.Хруцкага), вобразны лад і каларыстыку іх карцін.

3) У прааналізаваных намі эсэ, за выключэннем “Размова з аўтапартрэтам”, аўтар не імкнецца да падрабязнага ўзнаўлення біяграфічных фактаў мастакоў, а найперш засяроджвае ўвагу чытача на рэфлексіі і духоўных вытоках быцця гэтых творцаў.

4) У эсэістыцы В.Карамазава асвятляюцца важныя эстэтычныя праблемы: прынцыпы мастацтва і сэнс жыцця творчай асобы і (“Размова з аўтапартрэтам”, “З вокам і сэрцам Дон Кіхота”, “Крынічыць срэбра”), вытокі таленту (“Размова з аўтапартрэтам”, “Крынічыць срэбра”).

5) У абраным аўтарам жанры эсэ арганічна аб’яднаў факты з біяграфіі мастакоў, мастацтвазнаўчы аналіз іх творчасці і філасофскія развагі.

Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны пры падрыхтоўцы агульных лекцыйных і спецыяльных курсаў па гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя ў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, а таксама пры выкладанні беларускай літаратуры ў сярэдніх школах, гімназіях, ліцэях.

Спіс цытаваных крыніц:


1. Карамазаў, В.Ф. Размова з аўтапартрэтам / В.Ф. Карамазаў // Роднае слова. – 2008. − № 9. – С. 105-106.
2. Карамазаў, В.Ф. З вокам і сэрцам Дон Кіхота / В.Ф. Карамазаў // Роднае слова. – 2008. − № 11. – С. 104-105.
3. Карамазаў, В.Ф. Крынічыць срэбра / В.Ф. Карамазаў // Роднае слова. – 2008. – № 7. – С. 105-107.


Репозиторий ВГУ